Источник: "Наша слова" - 2017-08-09

# У Менску прэзентавана кніга пра Ігната Дамейку



31 ліпеня споўнілася 215 гадоў з дня нараджэння навукоўца-мінеролага, геолага Ігната Дамейкі, ураджэнца в. Вялікая Мядзведка Навагрудскага павета Менскай губерні, удзельніка Таварыстваў філаматаў і філарэтаў і паўстання 1830-1831 гадоў, нацыянальнага героя Чылі.



У Менск прыехалі праўнукі Ігната Дамейкі - Пас, Сесілія і Мігель Дамейкі. Госці ўзялі ўдзел у навуковай канферэнцыі "Геалогія і мінеральныя рэсурсы Заходу Усходне-Еўрапейскай платформы", прысвечанай юбілею даследчыка, якая праходзіла ў Нацыянальнай Акадэміі навук з 31 ліпеня па 3 жніўня.

31 ліпеня ў Міністэрстве замежных спраў адбылася прэзентацыя кнігі сеньёры Дамейкі "Ігнат Дамейка: з Мядзведкі - Сант'яга-дэ-Чылі (1802-1889)", перакладзенай з іспанскай на беларускую мову. Пас Дамейка жыве ў Аўстраліі, у яе пяць дачок і шасцёра ўнукаў. Яе бацька быў палітыкам, які быў вымушаны з'ехаць з сям'ёй у эміграцыю.

- Я вельмі ўсхвалявана цырымоніяй, - сказала сеньёра Пас Дамейка, праўнучка Ігната Дамейкі. - Мне вельмі прыемна бачыць яго партрэт у касцёле. Дон Ігнацыё быў добрым мужам і сем'янінам, у яго было чацвёра дзяцей, і сёння ў Чылі жывуць каля 200 яго нашчадкаў. Апошнія 20 гадоў я прысвяціла даследванню жыцця майго прадзеда. Пасля таго, як я перанесла аперацыю, і некалькі імкненняў перажывала клінічную смерць, дон Ігнацыё прыцягнуў мяне да сябе. Калі я прыйшла ў прытомнасць, то вырашыла, што буду даследваць яго жыццё. Я паехала на Беларусь, у Літву, Польшчу, Францыю, Чылі. На іспанскай мове я напісала кнігу, якая была выдадзена ў Чылі і перавыдадзена па-ангельску ў Аўстраліі. Самымі шчаслівымі, поўныя падарожжаў і прыгодаў, былі апошнія 20 гадоў майго жыцця, якія я прысвяціла майму прадзеду. У кнізе я імкнулася паказаць паўнату яго асобы. Ён быў рамантыкам і адначасова рэлігійнай асобай, навукоўцам, добрым бацькам.

Пра экспедыцыю ў Чылі прадстаўнікоў Беларусі, якая адбывалася ў 2012 годзе, распавеў касцельны актывіст Леанід Галубоўскі.

- На 200-годдзе Ігната Дамейкі ў інстытуце геалогіі НАН праводзілася канферэнцыя. Выкладчыкі геаграфічнага ўніверсітэта БДУ ў 2012 годзе адправіліся ў Чылі на чале з рэктарам БДУ Сяргеем Абламейкам, наведалі ўніверсітэт у Сант'яга, дзе працаваў наш суайчыннік. Там стаіць бюст Ігната Дамейкі. Капсулу з зямлёй з Беларусі мы даставілі ў радавую спачывальню сям'і Дамейкаў у Сант'яга. Удзельнікі экспедыцыі пабывалі ў гарах, наведалі Патагонію, экватарыяльныя раёны краіны і горад Ла-Серэна. Былая горная школа ў Ла-Серэне, а сёння -універсітэт, носіць імя Ігната Дамейкі. Нас правялі па аўдыторыях гэтага ўніверсітэта, паказалі калекцыю мінералаў з усяго свету, якую збіраў Дамейка. У геалагічным музеі стаіць помнік вучонаму. З Чылі на Беларусь таксама была дастаўлена капсула з зямлёй. У Менску ў сярэдняй школе №120 ёсць музей, прысвечаны вялікаму падарожніку і навукоўцу. Вучні школы пішуць пра яго свае даследванні і выступаюць на гарадскіх вучнёўскіх канферэнцыях.



У Чылі вельмі шануюць даследчыка-мінеролага, прафесара Ігната Дамейку. У яго гонар названыя вуліцы ў Сант'яга-дэ-Чылі, Вальпараіса і яшчэ ў васьмі гарадах Чылі, а таксама ў Вільні, Менску, Наваградку, Лідзе, Крупаве...

***Э. Дзвінская.***

На фота "Свабоды":
1. Нашчадкі Дамейкі ў Менску;
2. Пас Дамейка са сваёй кнігай, выдадзенай па-беларуску;
3. Уладзімір Макей і Пас Дамейка.

Э. Дзвінская. У Менску прэзентавана кніга пра Ігната Дамейку